УДК 001.12:[001.4+130.2]

# АРТЭФАКТ ЯК СТРУКТУРНАЯ АДЗІНКА КУЛЬТУРЫ

***А. І. СМОЛІК***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца пытанні дэфініцыі тэрміна «культурны артэфакт» як аднаго з найважнейшых паняццяў культуры і культуралогіі. Вылучаюцца і аналізуюцца падыходы да яго вызначэння як у сусветным, так і ў беларускім навуковым дыскурсе. Падкрэсліваецца, што даследаванне артэфакта ў якасці інтэлектуальнай духоўнай катэгорыі трэба ажыццяўляць і ў ракурсе яго матэрыяльнага разумення. Атрыбуцыя артэфакта як культурнай і культуралагічнай адзінкі адкрывае магчымасці для фарміравання і развіцця культурных даследаванняў, а таксама дазваляе сфарміраваць даследчыцкія кампетэнцыі.

***Ключавыя словы:*** артэфакт; культура; даследчыцкія падыходы; духоўнае; матэрыяльнае; кампетэнтнасць.

**Образец цитирования:**
Смолік АІ. Артэфакт як структурная адзінка культуры. *Человек в социокультурном измерении.* 2022;1:4–9.

**For citation:**
Smolik AI. An artifact as a structural unit of culture. *Human in the Socio-Cultural Dimension.* 2022;1:4–9. Belarusian.

**Автор:**
***Александр Иванович Смолик*** – доктор культурологии, профессор; заведующий кафедрой культурологии факультета культурологии и социально-культурной деятельности.

**Author:**
***Alexander I. Smolik***, doctor of science (cultural studies), full professor; head of the department of cultural studies, faculty of cultural studies and socio-cultural activities.
*kafkult@buk.by*

# АРТЕФАКТ КАК СТРУКТУРНАЯ ЕДИНИЦА КУЛЬТУРЫ

*А. И. СМОЛИК*[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет культуры и искусств, ул. Рабкоровская, 17, 220007, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются дефиниции термина «культурный артефакт» как одного из важнейших понятий культуры и культурологии. Выявляются и анализируются подходы к его выделению как в мировом, так и в белорусском научном дискурсе. Подчеркивается, что исследование артефакта как интеллектуальной духовной категории необходимо осуществлять и в ракурсе его материального понимания. Атрибуция данного феномена как культурной и культурологической единицы открывает возможности для формирования и развития культурных исследований, а также позволяет сформировать исследовательские компетенции.

***Ключевые слова:*** артефакт; культура; исследовательские подходы; духовное; материальное; компетентность.

# AN ARTIFACT AS A STRUCTURAL UNIT OF CULTURE

*A. I. SMOLIK*[a]

[a]*Belarusian State University of Culture and Arts, 17 Rabkoraŭskaja Street, Minsk 220007, Belarus*

The article deals with the definition of a cultural artifact as one of the most important concepts of cultural studies. The approaches to its definition in the world and Belarusian scientific discourses are highlighted and analysed. It is emphasised that the study of an artifact as an intellectual, spiritual category should also be carried out from the point of view of its material understanding. Attribution of an artifact to a cultural unit opens up opportunities for the formation and development of cultural research, and also allows the formation of research competencies.

***Keywords:*** artifact; culture; research approaches; spiritual; material; competence.

У сучасным штодзённым дыскурсе не заўсёды ўдала ўжываецца моднае цяпер слова «артэфакт». Дарэчы, прадстаўнікі навуковага гуманітарнага дыскурсу таксама часта выкарыстоўваюць гэты тэрмін. Так, беларускія мастацтвазнаўцы заснавалі навукова-тэарэтычны часопіс «Артэфакт». У навуковых тэкстах можна часта сустрэць абазначэнне прыродна-матэрыяльных аб'ектаў названым паняццем. Геолагі, часам знайшоўшы рэдкі мінерал, заносяць яго ў спіс артэфактаў. Тлумачыцца такая з'ява, на наш погляд, негрунтоўнымі культуралагічнымі ведамі. З гэтага ж вынікае і недарэчнасць ужывання выразаў «культура і мастацтва», «літаратура і мастацтва» і г. д. У фундаментальнай культуралогіі мастацтва выступае як адзін з важнейшых феноменаў духоўнай культуры, а літаратура – як від мастацтва.

Што ж такое артэфакт з пункту тэарэтыка-метадалагічнага гледжання сучаснай тэорыі культуры? Якія ў яго паходжанне, сутнасць і функцыі?

Адной з важнейшых сфер матэрыяльнай культуры з'яўляецца тэхнічная дзейнасць чалавека, мэта якой – адаптацыя да навакольнай дзікай часткі прыроды. Чалавек, як суб'ект культуры, вымушаны бясконца перапрацоўваць прыродныя аб'екты, неарганічную і арганічную матэрыю, ствараць з іх рэчы, неабходныя для задавальнення сваіх біялагічных і сацыяльных патрэб і інтарэсаў. У выніку такой працоўнай дзейнасці навакольны свет ператвараецца ў «другую прыроду», якую мы называем культурай. Па меры ўдасканалення матэрыяльна-тэхнічнай базы, развіцця псіхікі чалавека ўзнікае духоўная дзейнасць, фарміруюцца такія характэрныя для *homo sapiens* феномены, як грамадства, мова, мастацтва, рэлігія. З цягам часу вытворчая дзейнасць чалавека становіцца адухоўленай, сэнсава змястоўнай – адным словам, культурнай. Ператварэнне прыроды ў культуру ўжо адбываецца не інстынктыўна, а пад уздзеяннем духоўных, інтэлектуальных, рацыянальных установак чалавека.

Такім чынам, працоўныя працэсы і створаныя індывідам прадметы набываюць звышпрыродныя ўласцівасці. Яны адначасова застаюцца рэчыўнымі па субстраце і сацыяльнымі па функцыях, гэта значыць культурнымі. З аднаго боку, прадметы, створаныя чалавекам, з'яўляюцца прыроднымі, а з другога – культурнымі, таму што яны адухоўлены думкай асобы, ідэяй, канструктыўным планам, мэтай.

У той жа час неабходна заўважыць, што гэтыя першыя формы духоўнага акультурвання прыроды, на погляд расійскага вучонага М. С. Кагана, «былі не абстрактна-тэарэтычнымі, а практычна духоўнымі, гэта значыць ажыццяўляліся механізмамі ўяўлення, а не яшчэ слабым абстрактным мысленнем, увасабляліся ў форме вобразных уяўленняў, мысленчых карцін прыроднага быцця»[1] [1, с. 63].

Нямецкі філосаф М. Хайдэгер падзяляў усе аб’екты, з якімі сутыкаўся чалавек, на два тыпы: чыста прыродныя аб’екты і ненатуральныя, створаныя чалавекам прыстасаванні – і вылучаў адрозненні паміж імі. Чыстыя аб’екты, па яго меркаванні, выключаюць карыснасць і вытворчыя характарыстыкі. Прыстасаванні маюць дзве адметнасці: матэрыял і форму. Першая адметнасць вызначае размеркаванне і размяшчэнне ў прасторы матэрыяльных частак. Яна дыктуе не толькі размяшчэнне прадметаў, але абумоўлівае выбар матэрыялу і вызначае яго тып. Больш істотная розніца паміж чыстымі аб’ектамі і прыстасаваннямі, па Хайдэгеру, заключаецца ў тым, што ў апошніх функцыя з’яўляецца прыярытэтнай. Па сутнасці, гэта матэрыял з формай, якая ствараецца штучна. Такая рыса адрознівае прыстасаванні ад чыстых аб’ектаў [2, с. 362].

Такім чынам, у ненатуральна створаных рэчах, пачынаючы з пошуку неабходных матэрыялаў і распрацоўкі адпаведных форм, галоўнай з’яўляецца функцыя. З гэтага вынікае, што штучныя аб’екты ствараюцца рукамі чалавека, пры гэтым шмат увагі звяртаецца на знешнія фактары. Яны не ўтвараюцца ў выніку натуральнага развіцця, унутранай логікі самога аб’екта.

У культуралагічным дыскурсе аб’екты, створаныя суб’ектамі культуры ў працэсе практычна духоўнага асваення прыроды, прынята абазначаць паняццем «артэфакт». Дадзенае слова паходзіць ад лацінскага і складаецца з дзвюх частак: *arte* (ненатуральны, штучны) і *factus* (зроблены). Артэфакты – гэта прыродныя аб’екты, якія так ці інакш былі зменены людзьмі. Самым галоўным іх атрыбутам выступае рукатворнасць, а значыць, яе аб’ект створаны для чалавека. Артэфакты ўтрымліваюць мэту творцы, іх адметнасцю з’яўляецца тое, што сутнасць папярэднічае існаванню. Спачатку задумваецца пэўная функцыя, а потым адбываецца яе рэалізацыя ў працэсе вырабу штучных прадметаў. Пры гэтым функцыя – дадатак да натуральнага значэння.

Чалавек, як біялагічная сацыякультурная істота, знаходзіцца ва ўзаемадзеянні з трыма складанымі сістэмамі: прыродай, грамадствам, культурай. Апошняя з’яўляецца штучнай сістэмай, якая створана ў працэсе працоўнай дзейнасці, і выступае як працяг прыроды. У названых сістэмах маюцца падабенствы і адрозненні. Усе яны ўключаюць у сябе пэўныя структурныя элементы, што абумоўліваюць іх уласцівасці. Прыродны свет уяўляе сабой папуляцыі клетак і жывых арганізмаў, сацыяльная сістэма складаецца з чалавечых папуляцый (індывідуумаў, соцыумаў, інстытутаў), культура – з груп артэфактаў. Сістэмы, якія мы разглядаем, розным чынам звязаны з дзейнасцю чалавека і існуюць толькі з ёй. Узаемасувязь прыроды, грамадства і культуры ў працэсе антрапа-, сацыя- і культурагенезу падпарадкоўваецца пэўным агульным законам. За перыяд свайго існавання чалавецтва стварыла бясконцае мноства артэфактаў, якія, на погляд расійскага культуролага А. Б. Краснаглазава, знаходзяцца з *homa* ў пастаянным узаемадзеянні з моманту выдзялення чалавека ў самастойны род, і дзякуючы ім культурная эвалюцыя стала навогул магчымай [3].

У сучасных гуманітарных навуках існуюць розныя падыходы да вызначэння генезісу, сутнасці і функцый артэфактаў. Так, расійскі культуролаг К. М. Харужанка да артэфактаў культуры адносіць усялякі «штучна створаны аб’ект, які мае як фізічны, так і знакавы, ці сімвалічны, змест» [4, с. 37]. Заслугоўвае ўвагі інтэрпрэтацыя сутнасці артэфактаў заходнееўрапейскага філосафа А. Г. Саймана. Ён вылучае ў сувязі з гэтым чатыры аспекты. Па-першае, артэфакты сінтэзуюцца суб’ектамі культуры, хоць і не заўсёды з’яўляюцца вынікам стараннага планавання. Па-другое, ненатуральныя прадметы могуць імітаваць знешні выгляд прыродных аб’ектаў, не пераймаючы асноўныя характарыстыкі аднаго з іх ці цэлага шэрагу прыродных аб’ектаў. Па-трэцяе, філосаф характарызуе артэфакты зыходзячы з трох іх уласцівасцей: функцый, мэты і прыстасавання. Нарэшце, А. Г. Сайман лічыць, што пры праектаванні творцы артэфактаў нярэдка звяртаюць увагу не толькі на інфарматыўнасць, але і на іх нарматыўнасць [5].

Вядомы расійскі культуролаг А. Я. Фліер сцвярджае, што першасная форма існавання артэфакта вымяраецца яго карыснасцю і сродкамі сацыяльнай арганізацыі і інфармацыі. Аднак паступова ў працэсе эвалюцыі артэфакт набывае каштоўнаснае, сімвалічнае і эстэтычнае значэнне. Такім чынам, на погляд вучонага, усялякая культурная форма як узор рашэння задачы па задавальненні якой-небудзь групавой ці індывідуальнай патрэбы можа быць рэалізавана ў мностве артэфактаў, што ўяўляюць сабой практычныя акцыі, а таксама іх матэрыялізаваныя вынікі (у тым ліку інтэлектуальныя, вобразныя і інш.) [6, с. 148].

[1]Тут і далей пераклад наш. – *А. С.*

Згодна з канцэпцыяй структуралізму любы прадмет, які з'яўляецца мастацкім творам, неабходна лічыць артэфактам. Ён, як правіла, павінен мець матэрыяльнае ўвасабленне і быць носьбітам пэўных эстэтычных сэнсаў і свайго роду знешніх сімвалаў [7]. Такога пункту гледжання прытрымліваўся і беларускі даследчык Э. С. Дубянецкі. На яго погляд, акрамя матэрыяльных аб'ектаў, «артэфактамі культуры з'яўляюцца і ўсе феномены духоўнага жыцця соцыуму, якія інтэрпрэтуюцца як ідэацыйны бок быцця грамадства (навуковыя тэорыі, ідэі, мастацкія творы), а таксама спосабы паводзін індывідаў ці пэўных супольнасцей і г. д.» [8, с. 29].

З такой трактоўкай прыроды і сутнасці артэфактаў, на нашу думку, можна пагадзіцца, паколькі апошнія звязаны з агульным ладам жыцця і ўтрымліваюць недыферэнцыраваны досвед мастацтва, этыкі і эстэтыкі. Адначасова мноства артэфактаў валодаюць якасцямі асноўных каштоўнасцей: ісціны, дабра і прыгажосці. У сувязі з гэтым артэфакты неабходна ўспрымаць як аб'екты культуры, якія могуць задаволіць эстэтычныя патрэбы чалавека і служыць узорам ідэалаў у будучым. Нарэшце, штучныя аб'екты культуры ў стане рэалізаваць эстэтычную камунікацыю, паколькі мастацтва выконвае функцыю ўзаемадзеяння з дапамогай сімвалаў і знакавых сістэм. А. Б. Краснаглазаў таксама лічыць, што ў эстэтыцы паняцце «артэфакт» трактуецца этымалагічна. Дадзеным тэрмінам абазначаюцца аб'екты, якія створаны непасрэдна для выкарыстання ў сферы мастацтва [9, с. 45]. Такім чынам, з пазіцый эстэтыкі артэфакт – любы аб'ект, што з'яўляецца мастацкім творам.

У тэорыі мастацтвазнаўства вылучаецца асаблівы тып артэфакта, які абазначаецца паняццем «аўтарскі твор». У ім назіраецца змяшэнне розных тыпаў творчага характару: мастацкага, філасофскага, навуковага і інш. Такі артэфакт, як правіла, па меркаванні англійскага даследчыка Р. Лейтана, прызначаны для варыятыўнага ўзнаўлення ў матэрыяльных аналагах [10, с. 96]. Сімволіка-сэнсавая зменлівасць яго характарызуецца найбольшай дынамікай.

Працяглы час прадстаўнікі гуманітарных навук не ўдзялялі належнай увагі даследаванню прыроды, сутнасці і структуры артэфактаў. Час ад часу да іх вывучэння звярталіся археолагі, музеязнаўцы і этнолагі як да зыходных даных выключна з пазіцый гістарычнай каштоўнасці, перыядызацыі або разнастайнасці прадметаў побыту розных этнасаў. У той жа час даследаванне культурагенезу, механізмаў культурнай эвалюцыі, вызначэнне законаў культуры і яе марфалогіі паказалі, што без дасканалага аналізу артэфактаў рашыць пастаўленыя задачы немагчыма. Іх вывучэнне дазваляе прасачыць змены ў культурнай разнастайнасці чалавечага досведу. Фарміраванне культуралогіі на постсавецкай прасторы актуалізавала праблему артэфактаў як аднаго з прадметаў яе вывучэння. Цяпер ужо маецца шэраг прац, аўтары якіх спрабуюць упарадкаваць разнастайную сукупнасць артэфактаў, абазначыць іх марфалогію, ажыццявіць іх класіфікацыю і выявіць спосабы функцыянавання ненатуральных аб'ектаў культуры. Сёння ёсць падставы канстатаваць наяўнасць пэўных канцэпцый, што носяць міждысцыплінарны характар.

Так, канцэпцыя артэфактаў разглядаецца ў межах семіятычнага, структурнага і эвалюцыйнага падыходаў такімі расійскімі даследчыкамі, як Р. М. Алейнік, В. Б. Беламестнава, А. Г. Габрычэўскі, П. С. Гурэвіч, М. С. Каган, А. Б. Краснаглазаў, Ю. В. Ларына, Ю. М. Лотман, В. М. Мяжуеў, І. П. Мяркулаў, М. К. Пятроў, В. С. Рэпін, Э. В. Сакалова, Ю. Н. Салоніна, А. Я. Фліер і інш.

Нам падаецца, што найбольш комплексна і сістэмна прыроду і сутнасць артэфактаў на прыкладзе мастацкай літаратуры сярод названых аўтараў вывучае А. Б. Краснаглазаў. Культурна-семантычнае поле даследуемых аб'ектаў вучоны разглядае ў трох вымярэннях: культурна-трансляцыйным, прагматычным і тэхналагічным. На яго погляд, мастацкая літаратура з'яўляецца галіной культуры, у якой найбольш відавочна і дэманстратыўна выяўляецца рух артэфактаў (мастацкіх вобразаў) [9].

Аналагічных поглядаў, дарэчы, прытрымліваюцца і шэраг беларускіх даследчыкаў. Так, гродзенскія культуролагі П. К. Банцэвіч [11] і У. А. Жылко, вывучаючы аксіялагічны і сімвалічны ўзровень артэфактаў беларускай літаратуры і жывапісу як парадыгмальных тэкстаў, прыйшлі да высновы, што асаблівасць сістэмы каштоўнасцей у мастацкіх творах XIX ст. заключаецца ў тым, што большасць аксіялагем адносяцца да народнай (традыцыйнай) і рэлігійнай (хрысціянскай) сістэм светапоглядных каардынат.

Тэарэтычнае абгрунтаванне характару эвалюцыі артэфактаў музычнай творчасці здзейснена культуролагам І. М. Шумскай. Яна сцвярджае, што ў музычных творах беларусаў сімвалічна адлюстроўваюцца не толькі індывідуальныя інтэнцыі, творчыя арыентацыі і сацыякультурны досвед кампазітара, але і стылявыя асаблівасці, якія дамінуюць падчас стварэння артэфакта [12].

Аб'ектам культуралагічнага аналізу В. Ф. Таланцавай на працягу многіх гадоў з'яўляецца касцюм як артэфакт дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Культуролаг выявіла структуру семіётыкі касцюма, якая ўяўляе сабой сістэму знакаў, сінтагматычных і парадыгматычных адносін. Пры гэтым яна

паказала, што пры трансфармацыі семіятычных прымет касцюма яго інварыянтная семіятычная структура застаецца нязменнай [13].

Аналіз відаў і жанраў артэфактаў беларускай мастацкай культуры ажыццявіла М. М. Сакалоўская. Яна ахарактарызавала спосабы функцыянавання артэфактаў беларускай архітэктуры, музычнага і тэатральнага мастацтва ў межах парадыгм XIX–XX стст. (асветніцтва, рамантызм і рэалізм) [14].

Беларускія культуролагі прысвяцілі шэраг прац даследаванню артэфактаў, якія маюць філасофскі і навуковы характар. Так, Э. А. Усоўская ў сваім дысертацыйным даследаванні і іншых навуковых працах разглядае постмадэрнізм як культурную парадыгму. Яна паказала, што постмадэрнізм у другой палове XX ст. аказаў значны ўплыў на такія духоўныя артэфакты, як гуманітарныя навукі, мастацтва, філасофія, эстэтыка. На думку культуролага, дадзеная парадыгма ўяўляла сабой комплекс светапоглядных установак, якія адметны прызнаннем мноства спосабаў і форм развіцця свету, крытычным мысленнем, адсутнасцю адзінага падыходу і фіксаванага пункту гледжання, бясконцасцю камбінацый, адмаўленнем прынцыпу бінарных апазіцый. Розныя версіі постмадэрнізму аб'ядноўвае прынцып радыкальнага плюралізму каштоўнасцей, норм і ідэалаў культуры [15].

Эвалюцыю сутнасці герменеўтыкі (ад майстэрства тлумачэння перакладу старажытных тэкстаў як артэфактаў да метадалагічнай асновы ўсіх гуманітарных навук) прааналізаваў беларускі доктар культуралогіі І. В. Марозаў. Герменеўтыка культуры, на яго думку, можа разглядацца ў якасці самабытнага метагістарычнага тэксту [16].

Айчынны культуролаг прафесар А. А. Павільч распачаў працэс станаўлення і развіцця метадалогіі па кампаратыўным вывучэнні разнастайнасці культурных артэфактаў. Ім абгрунтаваны статус кампаратывістыкі як напрамку сучаснай культуралогіі, вызначаны тэарэтыка-метадалагічны патэнцыял параўнальных даследаванняў артэфактаў культуры, паказаны асаблівасці рэалізацыі кампаратыўнага падыходу ў філасофіі, сацыяльных навуках і міждысцыплінарных гуманітарных галінах [17].

Падсумоўваючы вышэйсказанае, неабходна заўважыць, што ў айчыннай культуралогіі ў першай чвэрці XXI ст. інтэнсіфікавалася дзейнасць па вывучэнні розных аспектаў артэфактаў культуры. У той жа час у культуралогіі і памежных з ёй сацыяльна-гуманітарных навуках адсутнічаюць грунтоўныя спецыялізаваныя даследаванні артэфактаў як структурных элементаў культуры, іх будовы і класіфікацыі, галін, у якіх магчыма выкарыстанне атрыманых ведаў пры аналізе розных культурных феноменаў, у тым ліку твораў мастацтва. Прадметам даследаванняў культуролагаў не сталі яшчэ артэфакты як сэнсавыя, інфармацыйныя і функцыянальныя адзінкі культуры. Адначасова неабходна заўважыць, што ў сучасных гуманітарных працах сфарміравалася некалькі канцэптуальных падыходаў, якія могуць стаць тэарэтыка-метадалагічнай асновай для вывучэння фундаментальных атрыбутаў артэфактаў культуры.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Каган МС. *Философия культуры.* Санкт-Петербург: Петрополис; 1996. 416 с.
2. Хайдеггер М. Исток художественного творения. В: Хайдеггер М. *Работы и размышления разных лет.* Москва: Госиз; 1993. с. 47–119.
3. Красноглазов АБ. Артефакт. В: Левит СЯ, редактор. *Культурология. XX век. Энциклопедия. Том 1.* Санкт-Петербург: Университетская книга; 1998. с. 33–34.
4. Хоруженко КМ. Артефакты культуры. В: Хоруженко КМ, редактор. *Культурология. Энциклопедический словарь.* Ростов-на-Дону: Феникс; 1993. с. 37–38.
5. Саймон Г. *Искусственная наука.* Пекин: Коммерческое издание; 1987. 198 с.
6. Флиер АЯ. *Артефакты в культуре. Культурология для культурологов.* Москва: Академический проспект; 2000. с. 147–149.
7. Барт Р. От произведения к тексту. В: Барт Р. *Избранные работы. Семиотика. Поэтика.* Москва: Прогресс; 1989. с. 413–423.
8. Дубянецкі ЭС. Артэфакт. У: Дубянецкі ЭС. *Культуралогія. Энцыклапедычны даведнік.* Мінск: БелЭн; 2003. с. 9–30.
9. Красноглазов АБ. *Функционирование артефакта в культурно-семантическом пространстве* [диссертация]. Москва: МГУ имени М. В. Ломоносова; 1995. 290 с.
10. Лейтон Р. *Художественная антропология.* Гуйлинь: Гуансийский педагогический университет; 2009. 277 с.
11. Банцэвіч ПК. *Творчасць Уладзіміра Караткевіча ў кантэксце культуралогіі.* Гродна: ГДАУ; 2007. 310 с.
12. Шумская ІМ. Дыялектыка ўзаемадзеяння сацыяльнай дынамікі і музычнай культуры. *Весці Нацыянальнай акадэміі навук. Серыя гуманітарных навук.* 2001;3:33–35.
13. Таланцева ОФ. Костюм как художественный символ в изобразительном искусстве. *Мастацкая адукацыя і культура.* 2004;4:26–31.
14. Соколовская ММ. *Социодинамика художественной культуры Беларуси (конец XVIII – первая четверть XX в.)* [диссертация]. Минск: БГУКИ; 2019. 147 с.
15. Усовская ЭА. *Аксиологические и структурные основания стилистической множественности в художественной культуре постмодерна* [диссертация]. Минск: БГУКИ; 2000. 112 с.

16. Морозов ИВ. *Архитектурная герменевтика.* Минск: ТетраСистемс; 2001. 608 с.
17. Павильч АА. *Компаративные исследования культурного разнообразия: методологический опыт и компаративная проекция*. Минск: МГЛУ; 2017. 168 с.

## References

1. Kagan MS. *Filosofiya kul'tury* [Philosophy of culture]. Saint Petersburg: Petropolis; 1996. 416 p. Russian.
2. Heidegger M. [The source of artistic creation]. In: Heidegger M. *Raboty i razmyshleniya raznykh let* [The works and thoughts of different years]. Moscow: Gosiz; 1993. p. 47–119. Russian.
3. Krasnoglazov AB. [Artifact]. In: Levit SYa, editor. *Kul'turologiya. XX vek. Entsiklopediya. Tom 1* [Cultural studies. 20th century. Encyclopedia. Volume 1]. Saint Petersburg: Universitetskaya kniga; 1998. p. 33–34. Russian.
4. Khoruzhenko KM. [Artifacts of culture]. In: Khoruzhenko KM, editor. *Kul'turologiya. Entsiklopedicheskii slovar'* [Cultural study. Encyclopedic dictionary]. Rostov-on-Don: Feniks; 1993. p. 37–38. Russian.
5. Simon G. *Iskusstvennaya nauka* [Artificial science]. Pekin: Kommercheskoe izdanie; 1987. 198 p. Russian.
6. Flier AYa. *Artefakty v kul'ture. Kul'turologiya dlya kul'turologov* [Artifacts in culture. Culturology for culturologists]. Moscow: Akademicheskii prospekt; 2000. p. 147–149. Russian.
7. Bart R. [From work to text]. In: Bart R. *Izbrannye raboty. Semiotika. Poetika* [Selected works. Semiotics. Poetics]. Moscow: Progress; 1989. p. 413–423. Russian.
8. Dubjanecki ES. [Artifact]. In: Dubjanecki ES. *Kul'turalogija. Encyklapjedychny davednik* [Culturelogy. Encyclopedic reference]. Minsk: Belaruskaja jencyklapedyja imja Petrusja Browki; 2003. p. 9–30. Belarusian.
9. Krasnoglazov AB. *Funktsionirovanie artefakta v kul'turno-semanticheskom prostranstve* [Functioning of an artifact in a cultural-semantic void] [dissertation]. Moscow: Lomonosov Moscow State University; 1995. 290 p. Russian.
10. Leiton R. *Khudozhestvennaya antropologiya* [Artistic anthropology]. Guilin: Guanaghi Normal University; 2009. 277 p. Russian.
11. Bancevich PK. *Tvorchac' Uladzimira Karatkevicha w kantjeksce kul'turologii* [Creativity of Vladimir Korotkevich in the context of cultural studies]. Hrodna: Grodno State Agrarian University; 2007. 310 p. Belarusian.
12. Shumskaja IM. [The dialectic of the interaction of social dynamics and musical culture]. *Vesci Nacyjanal'nai akadjemii navuk. Seryja gumanitarnyh navuk*. 2001;3:33–35. Belarusian.
13. Talantseva OF. [The costume as an artistic symbol in the visual arts]. *Mastatskaja adukacyja i kul'tura*. 2004;4:26–31. Russian.
14. Sokolovskaya MM. *Sotsiodinamika khudozhestvennoi kul'tury Belarusi (konets XVIII – pervaya chetvert' XX v.)* [Sociodynamics of the artistic culture of Belarus (late 18th – first quarter of the 20th century)] [dissertation]. Minsk: Belarusian State University of Culture and Arts; 2019. 147 p. Russian.
15. Usovskaya EA. *Aksiologicheskie i strukturnye osnovaniya stilisticheskoi mnozhestvennosti v khudozhestvennoi kul'ture postmoderna* [Axiological and structural foundations of stylistic plurality in the artistic culture of postmodernity] [dissertation]. Minsk: Belarusian State University of Culture and Arts; 2000. 112 p. Russian.
16. Morozov IV. *Arkhitekturnaya germenevtika* [Architectural hermeneutics]. Minsk: TetraSistems; 2001. 608 p. Russian.
17. Pavil'ch AA. *Komparativnye issledovaniya kul'turnogo raznoobraziya: metodologicheskii opyt i komparativnaya proektsiya* [Comparative studies of cultural diversity: methodological experience and comparative projection]. Minsk: Minsk State Linguistic University; 2017. 168 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 10.12.2021.*
*Received by the editorial board 10.12.2021.*